Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

15.07.2016

**Зварот Беларускай нацыянальнай платформы**
**Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

## «У сувязі з тэрарыстычным нападам ў Ніцы»

**Амбасадзе Францыі ў Беларусі**

**Дэлегацыі ЕС у Рэспубліцы Беларусь**

*Мы, прадстаўнікі арганізацый грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, аб'яднаныя ў рамках Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства, выказваем свае глыбокія спачуванні Французскай Рэспубліцы і Еўрапейскаму Саюзу, чые грамадзяне ўвечары 14 ліпеня 2016 г. пацярпелі ад жахлівага акту гвалту і тэрарызму ў Ніцы.*

У гэтыя дні мы разам з вамі перажываем адбыўшуюся трагедыю, глыбока смуткуючы аб ахвярах і пацярпелых - мірных людзях Францыі, Еўрасаюза, іншых краін свету. У гэты няпросты момант мы хочам выказаць свае шчырыя спачуванні і падтрымку французскаму грамадству, і ў асаблівасці людзям, у чый дом прыйшла бяда.

Крываваму і безлітаснаму нападу ў Ніцы падчас святкавання нацыянальнага свята Францыі падвергнуліся не толькі мірныя жыхары, але і тыя каштоўнасці, якія глыбока падзяляем усе мы - свабода, роўнасць, дэмакратыя, гуманізм і ў першую чаргу - чалавечае жыццё, якое з'яўляецца безумоўнай вышэйшай каштоўнасцю.

Мы заклікаем Францыю, Еўрапейскі Саюз, краіны-партнёры да аб'яднання ў адстойванні гэтых каштоўнасцяў, супрацьдзеянні дзікаму тэрарызму і прыняцця адэкватных і сістэмных мер бяспекі для абароны сваіх грамадзян у сувязі з заўважным павялічэннем рызыкі тэрарыстычных пагроз у сучасным цывілізаваным свеце.

Мы верым у тое, што цывілізаваны свет зможа аб'яднацца вакол гэтай трагедыі і абараніць свае грамадствы, грамадзян і каштоўнасці. Вельмі важна зрабіць гэта не шляхам эскалацыі гвалту ці саступак тэрарыстам, а дзякуючы салідарным і асэнсаваным дзеянням ў інтарэсах правоў чалавека і нашых народаў.

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства*